# ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ПАВЕДАМЛЕННЕ

*Установа адукацыі “Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя І.П. Шамякіна”*
*Філалагічны факультэт*
*Кафедра беларускай і рускай філалогіі*
*праводзяць*

***Міжнародную навуковую канферэнцыю***
***“Шамякінскія чытанні: Пісьменнік – Асоба – Час”,***
прысвечаную 103 гадавіне з дня нараджэння Івана Пятровіча Шамякіна
і 80-годдзю з дня заснавання ўніверсітэта

***30 студзеня 2024 года*** – 103 гадавіна з дня нараджэння вядомага літаратурнага і грамадска-палітычнага дзеяча Івана Пятровіча Шамякіна.

***23 лютага 2024 года*** – 80 гадоў з дня заснавання Мазырскага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя І.П. Шамякіна.

Мерапрыемствы ***ЛІТАРАТУРНАГА ТЫДНЯ з міжнародным удзелам,***
прысвечаныя юбілейным і знакавым датам
УА “Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя І.П. Шамякіна”,
будуць праходзіць з **15** па **20 красавіка 2024 года**

***Шаноўныя калегі!***

Запрашаем вас прыняць удзел у мерапрыемствах ***ЛІТАРАТУРНАГА ТЫДНЯ***, у рамках якога **19 красавіка 2024 года** адбудзецца ***Міжнародная навуковая канферэнцыя “Шамякінскія чытанні: Пісьменнік – Асоба – Час”.***

Шамякінскія чытанні ўжо маюць сваю гісторыю, паколькі кола праблем, што абмяркоўваліся на канферэнцыі, прыцягвала пільную ўвагу навукоўцаў Беларусі, Расіі, Кітая, Польшчы, Азербайджана і іншых краін. Таксама ў чытаннях заўсёды ўдзельнічаюць настаўнікі, студэнты, вучні школ, гімназій, ліцэяў.

На абмеркаванне ў рамках ***Міжнародных Шамякінскіх чытанняў*** выносяцца наступныя праблемы:

1. *Творчасць і літаратурна-грамадская дзейнасць І. Шамякіна ў кантэксце XX стагоддзя.*
2. *Літаратурныя генерацыі XX–XXI стст.: эстэтычна-аксіялагічныя пошукі.*
3. *Сучасны літаратурны працэс: праблемы зместу і формы.*
4. *Гісторыка-культурная спадчына Беларусі.*
5. *Мова і стыль мастацкай літаратуры.*
6. *Актуальныя праблемы сучаснай лінгвістыкі.*
7. *Сучасныя мадэлі і метады выкладання моў і літаратур.*

*8. Роля сацыяльна-гуманітарных дысцыплін у фарміраванні маральнай культуры маладога пакалення.*

*9. Сучасная інфармацыйна-адукацыйная прастора: псіхалагічны і педагагічны аспекты.*

Формы ўдзелу ў канферэнцыі: вочная, завочная, анлайн. Пленарны даклад да 20 хвілін, секцыйны – да 10 хвілін. Праезд, харчаванне і пражыванне – за кошт арганізацыі, якая камандзіруе, або за кошт удзельнікаў чытанняў.

Па выніках канферэнцыі плануецца выданне зборніка матэрыялаў канферэнцыі. Пры яго выданні аргкамітэт пакідае за сабой права адбору і рэдагавання тэкстаў.

Рабочыя мовы – беларуская, руская, англійская, нямецкая.

Заяўку на ўдзел у канферэнцыі (форма дадаецца), артыкул па матэрыялах даклада, дагавор аб перадачы выключнага права (форма дадаецца; афармляецца ў двух экзэмплярах) просім даслаць **да 1 красавіка 2024 года** электроннай (**e-mail:** shamyakinmspu@yandex.ru) або звычайнай поштай па адрасе:

Гомельская вобл.,
г. Мазыр, 247760,
вул. Студэнцкая, 28,
УА МДПУ імя І.П. Шамякіна,
кафедра беларускай і рускай філалогіі.

***Заўвага:*** назва файла павінна супадаць з прозвішчам аўтара даклада. Напрыклад: 5_Іваноў_Іван_заяўка; 5_Іваноў_Іван_артыкул.

## ПАТРАБАВАННІ ДА АФАРМЛЕННЯ АРТЫКУЛАЎ

Даклад павінен змяшчаць вынікі ўласных даследаванняў аўтара (аўтараў). Працэнт арыгінальнасці тэксту павінен быць не менш за 60% пры яго праверцы праз сістэму Антыплагіят з улікам самацытавання (самацытаванне не больш за 10%). Аб'ём да 5-ці старонак, фармат А4, тэкставы рэдактар Microsoft Word; шрыфт Times New Roman, 14 pt, праз 1 інтэрвал, палі: верхняе, ніжняе, левае, правае – 25 мм; абзацны водступ 1,25 см. Не дапускаецца нумарацыя старонак, выкарыстанне аўтаматычных пастаронкавых спасылак, аўтаматычных пераносаў, разрэджанага або ўшчыльненага межлітарнага інтэрвалу. Схемы, табліцы, графікі ўстаўляюцца ў тэкст.

На першым радку па цэнтры вялікімі літарамі (паўтлусты шрыфт) друкуецца назва артыкула. З новага радка па цэнтры – ініцыялы, прозвішча, пасада, у дужках – горад, краіна. Праз радок друкуецца тэкст, выраўнаваны па шырыні старонкі. Тэкст артыкула рэкамендуецца структураваць наступным чынам: увядзенне, вынікі даследавання, высновы.

Спасылкі на літаратуру прыводзяцца ў тэксце ў квадратных дужках, напрыклад: [1, с. 10]. Спіс выкарыстаных крыніц (шрыфт Times New Roman, 12 pt) размяшчаецца адразу пасля тэксту ў парадку цытавання і афармляецца ў адпаведнасці з патрабаваннямі ВАК РБ https://mspu.by/files/biblioteka/obraztzy_oformleniya.pdf.pdf

У спіс літаратуры ўключаюцца толькі тыя крыніцы, на якія прыводзяцца спасылкі (якія цытуюцца) у тэксце артыкула.

**ОБРАЗЕЦ ОФОРМЛЕНИЯ МАТЕРИАЛОВ**

**НАЗВАНИЕ СТАТЬИ**

**И.О.Фамилия**
учитель истории I категории ГУО «    » (г. Мозырь)

*Текст статьи*

Список использованных источников

1. Алексеева, Л.М. Пермская школа метафоры / Л.М. Алексеева, С.Л. Мишланова // Вестник Пермского университета. Российская и зарубежная филология. – 2016. – Вып. 3(35). – С. 122–133.
2. Вардзелашвили, Ж. Метафорическая картина мира в русском языке: автореф. дис. … д-ра филол. наук: 10.02.02 / Ж. Вардзелашвили. – Тбилиси, 2002. – 32 с.

Тэлефоны для даведак:
+375 29 832 69 22 – загадчык кафедры беларускай і рускай філалогіі Чэчка Таццяна Мікалаеўна;
+375 236 21 59 31 – кафедра беларускай і рускай філалогіі.

***Увага:*** *Індывідуальнае запрашэнне з фінансавымі ўмовамі ўдзелу будзе даслана* ***да 03.04.2024.***

Аргкамітэт

Дадатак 1

Заяўка
на ўдзел у Міжнароднай навуковай канферэнцыі
"Шамякінскія чытанні: Пісьменнік – Асоба – Час"
(19 красавіка 2024 года)

Прозвішча ________________________________________________________
Імя ____________________________________________________________
Імя па бацьку _____________________________________________________
Месца працы ______________________________________________________
Пасада __________________________________________________________
Вучоная ступень ___________________________________________________
Вучонае званне ____________________________________________________
Назва даклада _____________________________________________________
Праблематыка _____________________________________________________
Электронны адрас __________________________________________________
Паштовы хатні
ці працоўны адрас _________________________________________________
Тэлефоны, факс ____________________________________________________
Дата ____________________________________________________________